па прадмету; фармулюецца сістэмны стыль мыслення, галоўнай рысай якога ў нашы дні стала гуманітарызацыя; выпрацоўваюцца практычныя навыкі, якія забяспечваюць эфектыўнасць будучай прафесіі; студэнты навучаюцца мастацтву пошуку; ажыццяўляюцца міжпрадметныя сувязі.

Ільіна Н.Р.,
ст.выкладчык

## БЕЛАРУСКА-РУСКІЯ ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ ВА ЎМОВАХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ

Ва ўмовах нацыянальнага адраджэння вельмі важна, каб вышэйшая навучальная ўстанова рыхтавала спецыялістаў, якія здольны свядома і адказна прымаць рашэнні. Выпускнікі Беларускага універсітэта культуры павінны станоўча ўплываць на працэс культурнага жыцця сваёй краіны. У гэтым працэсе вялікую ролю адыгрываюць руска-беларускія сувязі. Таму значнае месца ў курсе «Сусветная літаратура» павінен заняць спецкурс «Беларуска-рускія літаратурныя сувязі».

Культурныя сувязі паміж Расіяй і Беларуссю маюць даўнюю традыцыю. У гэтым рэчышчы не трэба забываць і ўзаемаадносіны паміж беларускімі і рускімі пісьменнікамі - талснавітымі мастакамі слова.

Нагадаем Ф.М.Дастаеўскага, чыя творчасць аказала вялікае ўздзеянне на эстэтычную свядомасць яго сучаснікаў і нашчадкаў. Героі Дастаеўскага - носьбіты важнай грамадскай, палітычнай і філасофскай думкі.

Беларускі празаік Максім Гарэцкі ў сваіх апавяданнях аб інтэлігентах «з-пад саламянай страхі» паказваў людзей, захопленых ідэяй адраджэння роднага краю і роднай культуры. У Дастаеўскага ж вучыўся М.Гарэцкі даследаванню таямніц чалавечай псіхікі. Рускага і беларускага пісьменнікаў збліжаюць маштабнасць і складанасць пастаўленых у іх творчасці пытанняў.

Для сённяшняй моладзі вельмі важным з'яўляецца пытанне пазнання нацыянальнага характару. Калі мы параўнаем такія творы, як «Браты Карамазавы» і «Антон», то ўбачым, што Дастаеўскі будуе канцэпцыю рускага нацыянальнага характару вакол забойства сынам бацькі, а М.Гарэцкі робіць спробу паказаць нацыянальны характар беларуса, даследуючы выпадак забойства бацькам сына. Блізкія да персанажаў з твораў Дастаеўскага ў аповесці Беларускі аўтар, Польскі публіцыст і Маскоўскі дэмакрат. Героі апавяданняў М.Гарэцкага «У лазні», «Роднае карэнне», «Рунь», Антон з аповесці «Антон», як і героі Дастаеўскага, знаходзяцца ў палоне духоўных пошукаў. У гэтых пошуках ўдзельнічаюць і інтэлігенты, і простыя сяляне. Мара аб духоўна прыгожым чалавеку яднае творы беларускага празаіка М.Гарэцкага і рускага мастака слова Ф.Дастаеўскага.

Вялікай папулярнасцю на Беларусі карысталася і карыстаецца імя Л.Талстога. У яго было шмат карэспандэнтаў з ліку нашых суайчыннікаў. Жыхары Мінска ў 1908 г. абралі яго ганаровым членам Мінскай гарадской бібліятэкі. Сам Л.Талстой клапаціўся аб пашырэнні асветы, таму высылаў кнігі для сельскіх школьных бібліятэк, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі. Вялікі рускі пісьменнік лічыў сапраўднай тую літаратуру, якая была блізкай і зразумелай простаму чытачу. У асобе рускага празаіка беларускім пісьменнікам бачыўся абаронца права беларуса на сваю мову, сваю культуру, якой бы мужыцкай яна ні здавалася «адукаванаму» чытачу. Творы Л.Талстога перакладаліся на беларускую мову і друкаваліся на старонках «Нашай нівы». Значную ролю талстоўскія ідэі адыгралі і ў творчасці М.Гарэцкага, асабліва ў распрацоўцы тэмы першай сусветнай вайны.

Ва ўмовах нацыянальнага адраджэння станаўленне беларускай мастацкай мовы з'яўляецца справай агульнаграмадскай. І літаратура набывае універсальны характар, выяўляючы і канцэнтруючы ўсе разнастайныя праявы нацыянальнай духоўнасці.

Саладоўнікаў С.В.,
дацэнт

## МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА І ПРАБЛЕМЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ГУМАНІТАРНАЙ АДУКАЦЫІ

Удасканаленне гуманітарнай адукацыі ў сучасных умовах ляжыць на шляхах павышэння духоўнага ўзроўню студэнта. А духоўны ўзровень яго знаходзіцца ў прамой залежнасці ад шырыні гуманітарнага кругагляду. Тут і глыбокія веды, і добры мастацкі густ, і пэўная вытанчанасць. Гуманітарны кругагляд таксама прадугледжвае разуменне праблем, якія стаяць перад чалавецтвам у канцы XX стагоддзя.

У гуманітарнай адукацыі заўсёды значную ролю адыгрывалі такія дысцыпліны, як гісторыя, філасофія, філалогія (літаратура і мова), эканоміка, мастацтвазнаўства. Традыцыйна ўсе гэтыя дысцыпліны ў ВНУ вывучаюцца паасобку. Тым не менш пры аналізе літаратурных твораў вылучаюцца філасофскія і гістарычныя аспекты, эканамічныя і сацыяльныя, псіхалагічныя і інш. Героі літаратурных твораў нясуць на сабе адбіткі самых розных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характэрных рыс і свайго часу, і мінулага, і свайго этнасу.

Асаблівае месца ў сучаснай літаратуры займае навуковая фантастыка. У яе творах сінтэзуецца матэрыял сённяшняй гісторыі, тыя ці іншыя станоўчыя ці адмоўныя тэндэнцыі экстрапалююцца ў будучыню, і такім чынам высвятляецца сутнасць навуковых ці сацыяльных з'яў. У мастацкіх мадэлях грамадства, ствараемых пісьменнікамі-фантастамі А.Азімавым, С.Лемам, Ф.Хэрбертам, У. ле Гуін, Р.Шэклі і іншымі, чытач бачыць аспекты эканамічныя, філасофскія, сацыяльныя. А наогул гуманітарная паэтыка навуковай фантастыкі дазваляе нам зірнуць па-новаму на чалавека, на само чалавецтва, на Сусвет. Яна дапамагае ўключыць у светапогляд прыродазнаўчыя аспекты, прымушае ўлічваць як «цывілізацыйны аргумент» навуку і тэхніку, іх уплыў на ўсе бакі чалавечага жыцця. Традыцыйнаму рэалізму цяжка ахапіць увесь шэраг сённяшніх праблем, якія стаяць перад людзьмі. А вырашаць гэтыя праблемы без гуманітарнай адукацыі - значыць выбіраць стратэгію на ўзроўні каменнага веку.

Напрыклад, на аснове дасягненняў біялогіі, хіміі, медыцыны, кібернетыкі не толькі ідзе напружаная праца па стварэнню штучнага інтэлекту, але і адбываецца працэс умяшання ў чалавечы арганізм з мэтай яго ўдасканалення. Вынікі тут могуць быць розныя, у тым ліку і з'яўленне на планеце новага тыпу разумнай істоты, якая можа змяніць чалавека, а можа прывесці і да знішчэння жыцця на Зямлі.

Свае нюансы ў гуманітарную адукацыю ўносяць паняцці, звязаныя з космасам, новымі вынаходніцтвамі, якія мяняюць жыццё і ўплываюць на духоўны стан чалавека.

Студэнты гуманітарных ВНУ атрымліваюць гуманітарную адукацыю ў працэсе засваення праграм тых курсаў, якія вывучаюцца ва ўстановах. Але як быць студэнтам тэхнічных ВНУ? Ды і наогул, як зараз выкладаць літаратуру, калі шырокае распаўсюджанне набылі тэлебачанне, радыё?

Няхай М.В.,
дацэнт

## РОЛЯ СПЕЦКУРСА «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА РАМАНА» Ў ВЫХАВАННІ СТУДЭНТАЎ

У сувязі са скарачэннем колькасці гадзін, якія адводзяцца на выкладанне літаратуры, недасканаласцю праграм, вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў, дапаможных крыніц для выкладчыкаў востра паўстае праблема аб насычанасці лекцыйных, семінарскіх і самастойных заняткаў студэнтаў дзённага і завочнага навучання ўсіх факультэтаў універсітэта. З мэтай больш эфектыўнага выкладання беларускай літаратуры з гэтага навучальнага года ўведзена выкладанне спецкурса па гісторыі развіцця беларускага рамана. Спецкурс прадугледжвае разгляд тыпалогіі жанру рамана 20-х - пачатку 90-х гадоў на прыкладзе творчасці вядучых пісьменнікаў XX стагоддзя розных ідэйна-філасофскіх арыентацый. Ядро ідэйна-мастацкага аналізу складаюць раманы Я.Коласа, Ц.Гартнага, М.Гарэцкага, Ядвігіна Ш., М.Зарэцкага, К.Чорнага, П.Галавача, Я.Нёманскага, С.Баранавых, Р.Мурашкі, Я.Маўра, Э.Самуйлёнка, М.Паслядовіча, П.Пестрака, М.Лынькова, Я.Брыля, М.Машары, М.Лобана, А.Чарнышэвіча, І.Шамякіна, І.Мележа, В.Быкава, У.Караткевіча, І.Навуменкі, А.Адамовіча, В.Адамчыка, І.Чыгрынава, І.Пташнікава, Б.Сачанкі, Л.Дайнекі, Г.Далідовіча, А.Лойкі, В.Коўтун, Я.Радкевіча, В.Чаропкі і іншых. Творчасць кожнага з іх уяўляе сабой пэўную лінію развіцця беларускага рамана, найбольш поўна перадае яго рух да дасканаласці. У працэсе вывучэння спецкурса будзе паказана, з якімі цяжкасцямі асвойвалі пісьменнікі новыя тэматычныя пласты, як у іх творах выспявалі спецыфічныя рысы і ўласцівасці новых раманных разнавіднасцей.

У працэсе даследавання жанру выразна выяўляюцца элементы сацыяльна-псіхалагічнага, сямейна-бытавога, філасофскага, палітычнага, ідэалагічнага рамана з яго пільнай увагай да аб'ектыўнай рэчаіснасці, з выяўленнем залежнасці чалавека ад акаляючага свету, з разнастайнасцю сацыяльных тыпаў, з нацыянальнай своеасаблівасцю, са шматфігурнай кампазіцыяй, з сінтэзам шматлікіх вядучых тэндэнцый свайго часу, з некаторымі асаблівасцямі паэтыкі, арганізацыі апавядальнай плыні. Вялікая ўвага звернута на творчасць раманістаў гістарычнай тэмы, якая асабліва выяўляе сваю сапраўдную ідэалагічную і эстэтычную значнасць жанру, калі ў нашым грамадстве актывізаваўся навуковы і філасофскі падыход да шматлікіх з'яў мінулага і цяперашняга, калі выразна праявілася неабходнасць пераасэнсавання вопыту мінулай гісторыі. Будуць падрабязна ахарактарызаваны асноўныя этапы ў развіцці беларускага рамана: 20-30-я гады, 60-я - першая палова 80-х гадоў, вызначаны традыцыі, якія знойдуць свой працяг у літаратуры канца 80-х - пачатку 90-х гадоў.

Вывучэнне рамана 20-90-х гадоў выклікае значныя цяжкасці ў студэнтаў, бо гэты жанр з'яўляецца адным з найменш вывучаных у гісторыі беларускай літаратуры. У нашым літаратуразнаўстве няма устойлівай цікавасці да вывучэння рамана наогул, у тым ліку і такой яго жанравай разнавіднасці, як гістарычны